# «Светлы ж след будзе вечна жывым…”

(агляд жыцця і творчасці)

***Да 130-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча***

Мэта:знаёмства навучэнцаў з жыццём, творчасцю,асобай пісьменніка.

Задачы: спрыяць развіццю маўлення навучэнцаў, выпрацоўцы камунікатыўных навыкаў; выхаванне цікавасці да беларускай літаратуры, гісторыі, роднага слова, сучаснай беларускай культуры.

Форма правядзення: бібліятэчны урок

Абсталяванне: мультымедыйная прэзентацыя

*“Ёсць паэты, якія пішуць творы, каб потым з іх выдаць выбранае, але ёсць і паэты, што пішуць толькі выбранае. Да такіх і належыць Максім Багдановіч”.*

Максім Танк



**Максім Адамавіч Багдановіч** - ***беларускі паэт, публіцыст, літаратуразнавец, перакладчык, класік беларускай літаратуры, адзін са стваральнікаў беларускай літаратуры і сучаснай літаратурнай беларускай мовы.***

# Скарбы куфра Багдановічаў



***Нарадзіўся Максім Адамавіч Багдановіч***
***9 снежня 1891 у Мінску ў сям'і***
***настаўніка прыходскага вучылішча.***



Бацька М. Багдановіча –
**Адам Ягоравіч Багдановіч**

**Адам Ягоравіч Багдановіч – бацька паэта – скончыў Нясвіжскую семінарыю, займаўся збіраннем і вывучэннем беларускага фальклору  і этнаграфіі, быў вучоным, перадавым чалавекам і грамадскім дзеячам.**



Маці М. Багдановіча –
**Марыя Апанасаўна**

***Маці, Марыя Апанасаўна, натура чулая і багатая, захаплялася музыкаю, педагогікаю, літаратурай. Спрабавала пісаць і нават надрукавала ў губернскай газеце апавяданне “Накануне Рождества”. Нечакана ў маі 1896 года Марыя Апанасаўна пачала хутка згасаць – выявіліся скарацечныя сухоты – і ў кастрычніку таго ж года яе не стала.***



Апавяданне Марыі Панасаўны на старонках газеты «Гродненские губернские ведомости» (1893).

*Максім нарадзіўся ў Мінску, потым пражыў чатыры гады ў Гродне і ў пяцігадовым узросце з'ехаў з Беларусі. У Гродна сям'я Багдановічаў пераехала ў ліпені 1892 і пражывала да 1896 года. У іх збіралася прагрэсіўная інтэлігенцыя - настаўнікі, лекары, афіцэры. Музыцыравалі, чыталі, спрачаліся. Шмат увагі надзялалася дзецям – далучэнню іх да роднай прыроды, народнай казкі. Можа, згадка, уяўленне пра іх і нарадзілі элегічныя,урачыста – прасветленыя радкі ў адным*

*з яго вершаў:*

*І жалобна, сумна трубы*

*У Гародні граюць.*



*Дом – музей паэта ў Гродне*

# Маладыя гады – маладыя жаданні

*У Ніжнім Ноўгарадзе пачалося станаўленне Максіма Багдановіча, як беларускага пісьменніка. Тут ён свядома абраў цяжкі для яго шлях развіцця беларускай літаратуры. Гэты шлях быў няпросты, таму што Максім жыў у рускамоўным асяроддзі і беларускую мову яму прыходзілася вывучаць па кнігах.*





***Схільнасць да літаратурнай творчасці ў маладога Багдановіча выявілася рана – яшчэ ў гады навучання ў Ніжагародскай мужчынскай гімназіі.***

**Вызначальны ўплыў на фарміраванне эстэтыкі маладога паэта паралельна з фальклорам з самага пачатку аказала творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа**





# Паэтыка Максіма Багдановіча

*Пачатак літаратурнай дзейнасці М. Багдановіча адносіцца да 1907 г., калі ў газеце "Наша ніва" з'явілася алегарычнае апавяданне "Музыка".*

**У 1908 годзе быў напісаны і апублікаваны першы верш "Прыйдзе вясна".**


Год V. Вільня 26 Серпня (Августа) 1910 г. № 35.

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

Выходзіць што тыдзень рускімі і польскімі літэрамі.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вуліца, д. № 20.

**"Прыйдзе вясна"**

**Холадна. Вецер па полі гуляе,**
**Вые, як звер.**
**Снег узрывае, нуду наганяе,**
**-Кепска цяпер!**
**Але мне сэрца пяе: не нудзіся!**
**Прыйдзе вясна!**
**Гукне: "Прачніся, зямля!**
**Прабудзіся**
**З цяжкага сна!"**
**Сонца прагляне,зазелянее**
**Траўка ў лугу,**
**Гукне вясна і, як ветрам,**
**развее**
**Гора – нуду!**

*Росквіт творчай дзейнасці Максіма Багдановіча адбыўся ў іншым рускім горадзе – у Яраслаўлі, куды перавялі па службе яго бацьку. Жыццё ў Яраслаўлі – гэта час плённай пісьменніцкай працы Максіма, яго творчага пошуку і рэалізацыі сябе як слаўнага сына Беларусі. У гэты перыяд былі надрукаваны яго шматлікія рэцэнзіі, публіцыстычныя артыкулы, прысвечаныя гісторыі беларускай літаратуры, пераклады і ўласныя мастацкія творы*



*М. Багдановіч – гімназіст*



*Яраслаўская мужчынская гімназія*




- *Адзіны прыжыццёвы зборнік М. Бадановіча “Вянок” убачыў свет у 1913 годзе ў віленскай друкарні Марціна Кухты. Гэта выданне стала важнай падзеяй ў беларускай літаратуры і прынесла паэту вялікі поспех, прызнанне і славу. Зборнік “Вянок – гэта разважанні над вечнымі пытаннямі дабра і справядлівасці, кахання, дружбы, вернасці, жыцця і смерці, роздум аўтара пра гістарычнае мінулае Беларусі.*



# Каханне, або апошнія гады Максіма Багдановіча



У старэйшых класах гимназіі М. Багдановіч пазнаёміўся праз свайго аднакласніка Рафаіла Какуева з яго сястрой Ганнай. Яна была для Максіма Багдановіча высокім ідэалам адухоўленнасці і прыгажосці душы, крыніцай радасці і найвышэйшых перажыванняў. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што менавіта ёй прысвечаны славуты “Раманс” (“Зорка Венера ўзайшла над зямлёю”)

Ганна Какуева



На двары сям’і Какувых

Восенню 1916 года, скончыўшы юрыдычны ліцэй, паэт прыехаў у Мінск. Жыў у кватэры З.Бядулі. Уладкаваўся на работу ў губернскую земскую ўправу сакратаром харчовага камітэта, удзельнічаў у працы клуба беларускай мастацкай інтэлігенцыі “Беларуская хатка”, які прапагандаваў беларускае музычнае і тэатральнае мастацтва. У гэты цяжкі для радзімы час ён напісаў вядомую паэму “Страцім – лебедзь”. Твор стаў рэквіем мастака слова самому сабе, уласнаму трагічнаму лёсу. У яго было шмат творчых планаў: хацеў выдаць шэраг паэтычных зборнікаў (“Маладзік”, “Шыпшына”, але здзейсніць пры жыцці гэтыя намеры не паспеў.












**У канцы лютага 1917 года з – за абвастрэння хваробы пакінуў Мінск і зноў накіраваўся ў Крым. Лячэнне не дапамгло і 25 мая 1917 года М.Багдановіча не стала. Каля ложка знайшлі лісток паперы са словамі паэта, напоўненымі мужнасцю трагізмам:**



**У краіне светлай, дзе я**
**У белым доме ля сіняй бухты,**
**Я не самотны, я кнігу маю**
**З друкарні пана Марціна Кухты.**

**Максім Багдановіч памёр у Ялце, там стаіць сціплы помнік, куды прыходзяць землякі і прыносяць жывыя кветкі і паклон ад сі[illegible]ай Беларусі.**



***Жыццё і творчасць генія беларускай літаратуры на працягу многіх дзесяцігоддзяў нязменна знаходзяца ў цэнтры пільнаў ўвагі даследчыкаў, бібліёграфаў, гісторыкаў і тэарэтыкаў і тэарэтыкаў літаратуры. У іх сабраны пісьмы, успаміны, біяграфічныя матэрыялы, артыкулы пра паэта. Аўтары кніг сустракаліся з аматарамі творчасці паэта, нашчадкамі яго сваякоў не толькі ў Беларусі, але і ў расійскіх гарадах – Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, Ленінградзе і Маскве.***


















Сын Беларусі, паэт Максім Багдановіч даўно ўжо пераступіў абсягі роднай зямлі. Як свайго, яго прымаюць і за межамі Беларусі. Доўгім было развітанне з Радзімай. У свой родны горад ён вернецца праз …64 гады. Вернецца ўжо ў бронзе. І застанецца навечна…



***У гонар Максіма Багдановіча ўстаноўлены помнікі ў Мінску, Яраслаўлі, Маскве, Ялце і Місхоры. Памяць паэта ўшанавана ў назвах вуліц гарадоў Беларусі. Гэта садзейнічае адкрыццю новых старонак пісьменніка і абуджае жаданне яшчэ раз перачытаць яго творы***


Філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына»









**Стаіць ён з букецікам сваіх любімых васількоў перад будынкам опернага тэатра, задуменны, прыгожы і нязменна малады. І вусны міжвольна шэпчуць словы:**



***Будзь жа век малады,***
***Поўны светлымі днямі,***
***Пралятайце гады,***
***Залатымі агнямі.***

